Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. АЎТОРАК № 194 (28810)

РАЎНЕННЕ НА «ЗУБРАНЯ»

ХТО СТАЎ УЛАДАРОМ СЯЛА 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй РЫБАКОЎ, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:

«У сабекошце паліва кошт нафты займае каля 80 %. З пачатку года цана нафты вырасла на 40 %, пры гэтым адэкватнага павелічэння цэн, зыходзячы з усіх фактараў, у тым ліку курса нацвалюты, на нафтапрадукты не адбывалася. А шматразовае павышэнне ў гэтым годзе кошту паліва на адну капейку толькі дазволіла ўтрымаць на адным узроўні суадносіны кошту нафты і нафтапрадуктаў. У «Белнафтахіме» кожны тыдзень праводзяць маніторынг, ці не з'яўляецца трэнд росту цэн на нафту ўсплёскам. Пасля гэтага прымаецца рашэнне аб змене цэн на паліва».

КОРАТКА

- **У Беларусі пачаўся Тыдзень маці.**
- Білеты ў залу для гледачоў на галоўнае шоу дзіцячага «Еўрабачання-2018» прададзеныя, але ў рэалізацыі застаюцца білеты на танцпол і генеральную рэпетыцыю.
- **Для юрыдычных асоб і ІП могуць забараніць анлайн-гандаль ужыванымі рэчамі.**
- Першы чартарны рэйс у Хургаду адправіўся з Гродзенскага аэрапорта.

- **Звыш 155 тыс. турыстаў наведала Мінск па бязвізавым рэжыме з лютага 2017 года.**
- Зімовае дызельнае паліва пачне паступаць на беларускія АЗС з наступнага тыдня.

ISSN 1990 - 763X

Гарбузовыя дажынкі

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

Сёлета на сядзібе жыхара Рэчыцы Вадзіма БАРЫСЕНКІ вырас добры ўраджай яблыкаў, груш, вінаграду, бульбы, морквы і капусты, грэцкіх арэхаў і садовых буякоў. Не кажучы пра гарбузы. Сабраць крамяны вітамінны запас на зіму гаспадару шчыра дапамагалі дачка Аляксандра і 79-гадовая цешча Клаўдзія Іванаўна ТРАПКІНА.

Ініцыятыва

ПА ЦАГЛІНЦЫ

Мінскія валанцёры 60+ аднаўляюць унікальную сядзібу Наркевіча-Ёдкі

На руінах сядзібы Якуба Наркевіча-Ёдкі, якая знаходзіцца ў вёсцы Наднёман, што ў Уздзенскім раёне — амаль на мяжы з Капыльскім, — мінчанка Валянціна КОРЗУНАВА апынулася даволі выпадкова. Успамінае сваё першае ўражанне: «Калі ўбачыла гэтыя маляўнічыя сядзібныя пабудовы, якія ляжаць у руінах, мяне ахапіла інстынктыўнае пачуццё: трэба ратаваць!» Выдатная архітэктура, але ў цалкам закінутым, дзікім стане... А калі яна вывучыла біяграфію былога ўладальніка сядзібы, то загарэлася яшчэ больш. І было з-за чаго... СТАР. 15

Валянціна КОРЗУНАВА на фоне сядзібы.

Ведай нашых

НАЙЛЕПШАЯ!

Арына САБАЛЕНКА прызнана вядучай тэнісісткай свету ў верасні

Такое званне беларуска атрымала па выніках галасавання на сайце Жаночай тэніснай асацыяцыі. Акрамя нашай суайчынніцы, на яго прэтэндавалі шостая ракетка планеты японка Наомі Асака і чэшка Караліна Плішкава, якая займае сёмае месца ў сусветным рэйтынгу.

Нагадаем, у верасні Сабаленка выйграла турнір катэгорыі «Прэм'ер 5» у кітайскім Ухані і паднялася ў рэйтынгу WTA на 16-ю пазіцыю. Перад адкрытым чэмпіянатам Кітая, які завяршыўся на гэтых выхадных у Пекіне, Арына працягвала прэтэндаваць і на ўдзел у выніковым турніры года WTA ў Сінгапуры, але для гэтага ёй трэба было дайсці да фіналу, беларуска ж «вылецела» на стадыі 1/4 і не трапіла ў васьмёрку найлепшых.

Такім чынам, у абноўленым рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі Арына Сабаленка зараз упершыню ў кар'еры ўзнялася на 11-е месца. На гэтым тыдні яна згуляе на турніры ў кітайскім Цяньцзіні.

Аляксандра Сасновіч займае 31-е месца ў сусветным рэйтынгу, Вікторыя Азаранка — 55-я, Вера Лапко знаходзіцца на 62-й пазіцыі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.